З першых вуснаў

# «Прыярытэтным кірункам бачым сумесную работу дзяржаў па далейшай лібералізацыі гандлю паслугамі»

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на Глабальным саміце гандлю паслугамі ў Пекіне. Форум, прысвечаны лічбавым тэхналогіям, праходзіць у анлайн-фармаце.**

Па словах Прэзідэнта, за гады дружбы Беларусі і Кітая неаднаразова пераконваліся ў паслядоўнасці палітыкі Пекіна, які аб'ядноўвае многа дзяржаў у рамках ініцыятывы «Пояс і шлях» на ўмовах справядлівага, раўнапраўнага, узаемавыгаднага супрацоўніцтва.

«Больш за тое, перажытыя ўзрушэнні, абумоўленыя пандэміяй і іншымі глабальнымі выклікамі, толькі ўмацавалі яго. Правядзенне выстаўкі ў гэты няпросты час — вельмі важны і сімвалічны крок Кітайскай Народнай Рэспублікі. Бо закрыццё граніц, зніжэнне турыстычнай актыўнасці, разрыў лагістычных ланцужкоў і рост пратэкцыянізму, каласальны націск на сістэму аховы здароўя, адмена міжнародных культурных мерапрыемстваў сталі беспрэцэдэнтным выпрабаваннем для рынку паслуг», — сказаў Аляксандр Лукашэнка ў сваім відэазвароце.

Але пры гэтым крызіс стымуляваў бум лічбавых тэхналогій і паслужыў свайго роду імпульсам для якаснай перазагрузкі традыцыйнай сферы паслуг. Як мяркуе кіраўнік краіны, у гэтым кантэксце ўражвае перадавы вопыт Кітая па развіцці і ўкараненні паслуг дыстанцыйнай адукацыі, анлайн-дыягностыкі і лячэння, прымяненні лічбавых тэхналогій у галіне турызму.

«Беларусь удзяляе асаблівую ўвагу нарошчванню экспарту і імпарту паслуг. Разлічваем на пашырэнне супрацоўніцтва з Кітаем у гэтай сферы як адным з ключавых партнёраў нашай краіны. У якасці прыярытэтнага кірунку бачым сумесную работу дзяржаў па далейшай лібералізацыі гандлю паслугамі, ліквідацыі бар'ераў, прыцягненні інвестыцый», — дадаў Прэзідэнт.

Ён канстатуе, што рост глабальнай электроннай камерцыі стаў эфектыўным рэсурсам для аднаўлення эканамічнага росту, і Беларусь бачыць вялікія перспектывы ў выхадзе на кітайскія анлайн-пляцоўкі для прасоўвання паслуг у сферах адукацыі, турызму, медыцыны. Таксама, заявіў Аляксандр Лукашэнка, краіны павінны актывізаваць распрацоўку мер для павелічэння аб'ёму турыстычных паслуг.

«У заключэнне хацеў бы падкрэсліць, што мы працягнем рабіць свой унёсак у найхутчэйшае аднаўленне сусветнай эканомікі і развіваць разнапланавае і ўзаемавыгаднае міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы паслуг у інтарэсах нашых краін і народаў», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Міжнародны форум па гандлі паслугамі CIFTIS — найбуйнейшая ў Кітаі экспазіцыя ў гэтай галіне. Яна праходзіць у Пекіне з 2012 года. Экспазіцыя CIFTIS-2021 асвятляе пытанні лічбавай эканомікі, вугляроднай нейтральнасці, а таксама прафілактыкі эпідэмій.

Слова дэпутата

# Гістарычна абгрунтаванае свята

**Старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Леанід БРЫЧ:**



— Думаю, што мы яшчэ да канца не ўсвядомілі, наколькі важная дата для беларускага народа стала цяпер дзяржаўным святам. Так склалася, што мы, маю на ўвазе шырокія колы грамадскасці, крышачку забыліся пра дзень 17 верасня, пра аб'яднанне дзвюх частак Беларусі, якое адбылося ў 1939 годзе. Вядома, дзецям расказвалі пра тыя падзеі на ўроках гісторыі, але, відаць, не асабліва засяроджваючыся, нібы крыху мімаходзь. Сёння ў гарадах, пасёлках Заходняй Беларусі ёсць вуліцы 17 Верасня. Але яшчэ паўгода таму, калі б спыніў побач з шыльдай юнака ці дзяўчыну і спытаў, чаму так названа вуліца, не ўпэўнены, што многія адказалі б правільна. І за гэта, несумненна, адказнае старэйшае пакаленне.

Як вядома, указаную дату ў Беларусі святкавалі афіцыйна да 1949 года. А потым пакрысе мерапрыемствы станавіліся меншыя, непрыкметныя, адным словам, пра падзею сталі забывацца. Зразумелыя вытокі такой палітыкі: нашы папярэднікі не хацелі засяроджваць увагу на гістарычным факце, каб не нагадваць суседзям пра не самыя лепшыя старонкі гэтай самай гісторыі. Але ж, як паказалі падзеі апошняга часу, нічога не варта забываць са свайго мінулага. І перш за ўсё для таго, каб не паўтарылася.

А падзея, што адбылася 17 верасня больш за 80 гадоў таму, сапраўды знакавая для краіны. Тыя 4 мільёны чалавек, што далучыліся да нас тады, разам з другой паловай насельніцтва сталі адзіным народам. І мы, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, рэлігій, культур, жывём у міры і згодзе многія гады. Нам сапраўды ёсць чым ганарыцца, ёсць што святкаваць. А Дзень народнага адзінства не за адзін год стане сапраўдным святам. Паступова будуць нараджацца традыцыі, формы святкавання, вымалююцца найбольш прымальныя мерапрыемствы, будзе прыцягвацца ўсё больш дзяцей, моладзі, і свята зойме сваю пачэсную нішу ў шэрагу іншых дзяржаўных свят нашай краіны.

**Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## УЛАДА НА СУВЯЗІ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 4 верасня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.**

Тэлефонныя лініі ў гэтую суботу з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама **АЛЬШЭЎСКІ Вадзім Іванавіч** (80162213121);
- першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама **МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч** (80212222222);
- старшыня Гомельскага аблвыканкама **САЛАВЕЙ Генадзь Міхайлавіч** (80232331237);
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама **НЯВЕРА Віталь Іосіфавіч** (80152735644);
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама **СТРАХАР Руслан Барысавіч** (80222501869);
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама **КУРЛЕНКА Дзяніс Мікалаевіч** (80175004160);
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама **ТРУШЧАНКА Юрый Уладзіміравіч** (80172224444).

Парламенцкі дзённік

# МОЛАДЗІ ЦІКАВА

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ сустрэлася з вучнямі 10 класа сталічнай гімназіі № 16. Знаёмства дэпутата з моладдзю было прымеркавана да Дня ведаў і прайшло ў сценах ніжняй палаты беларускага парламента.**



«Дзень ведаў ужо стаў добрай традыцыяй, што нашы дзяржаўныя органы прымаюць у сваіх сценах тых, хто вызначаецца з будучыняй, з выбарам прафесіі, увогуле, з разуменнем: што адбываецца ў дзяржаве, па якіх правілах, па якіх законах мы жывём і хто працуе з гэтым, — пракаментавала парламентарый вынікі сустрэчы. — Сёння ў Палаце прадстаўнікоў праведзены ўрок ведаў з вучнямі, выпускнікамі адной з гімназій. Вельмі прыемна, што той, хто сюды прыйшоў (а магчыма ж, нехта з іх будзе працаваць тут праз пяць гадоў альбо трохі больш), цікавіцца: якія сёння законы, якія зменены чакаюцца ў жыцці, асабліва маладых людзей. Іх пытанні, якія датычацца сацыяльнай абароны, маладзёжнай палітыкі, эканамічнага развіцця дзяржавы, сведчаць пра тое, што моладзь сёння дастаткова развітая і з ёй неабходна абмяркоўваць жыццёвыя пытанні, бо гэта — наша агульнае жыццё».

Дэпутат адзначыла адзінства падыходу тых, хто працуе цяпер (у тым ліку ў Палаце прадстаўнікоў), і тых, хто пакуль стаіць перад выбарам прафесіі.

«Гэта паказчык таго, што ў будучыні мы зможам рэалізаваць тыя задачы, якія стаяць у нашай дзяржаве», — лічыць старшыня парламенцкай камісіі.

Святлана Любецкая расказала школьнікам аб ролі інстытута парламентарызму ў забеспячэнні стабільнага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і актуальных задачах дэпутацкага корпуса.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ААН: Афганістан стаіць на мяжы гуманітарнай катастрофы



**Каардынатар гуманітарнай дапамогі ў Афганістане па лініі ААН Раміз Алакбараў заявіў, што Афганістан стаіць на мяжы гуманітарнай катастрофы, паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН.**

Як падкрэсліў Раміз Алакбараў, ААН і яе партнёры працягваюць рабіць усё магчымае, каб пазбегнуць гуманітарнай катастрофы, аднак для гэтага арганізацыі патрабуецца сур'ёзная міжнародная падтрымка. Прадстаўнік ААН паведаміў: у краіне, якая перажыла жорсткую засуху, галоўная праблема — недахоп харчавання. Больш за палову афганцаў не ведаюць раніцай, ці ўдасца ім сёння паесці, у краіне не хапае і медыкаментаў.

Аэрапорт Кабула закрыты, але ААН і яе партнёрскія арганізацыі знаходзяць іншыя шляхі адправіць дапамогу. У краіну ўжо дастаўлена каля 600 тон харчавання. Яно асабліва патрэбна дзецям, палова якіх хутка апынецца на мяжы знясілення. Гуманітарныя супрацоўнікі таксама дапамагаюць згубленым, у тым ліку ў аэрапорце, дзецям уз'яднацца са сваімі блізкімі.

Адзначаецца, што, як бы ні працавалі работнікі ААН і іх калегі з іншых арганізацый, іх магчымасці несупастаўныя з маштабамі патрэб. Яшчэ да захопу ўлады талібамі ААН прасіла міжнародную супольнасць даць на дапамогу Афганістану $1,3 млрд. На сёння атрымана толькі $400 млн.

Як адзначыў прадстаўнік ААН, талібы абяцалі не перашкаджаць арганізацыі дастаўляць дапамогу людзям, аднак канкрэтная сітуацыя на месцах залежыць ад розных фактараў.

## У сетцы высмеялі візіт Зяленскага ў ЗША

**Карыстальнікі ўкраінскага агенцтва УНІАН раскрытыкавалі прэзідэнта Уладзіміра Зяленскага, які пасля сустрэчы з амерыканскім калегам Джо Байдэнам прызнаўся, што забыўся абмеркаваць з ім ягоны візіт у Кіеў. Украінскі лідар зараз знаходзіцца з рабочым візітам у ЗША.**

«Хто б сумняваўся, «палітык», — абурыўся карыстальнік Юрый Кліменка.

«А на пііяніна сыграць не забыўся!» — зыранізаваў Дзмітрый Токараў.

«Без слёз немагчыма чытаць прамовы Зяленскага! Набор слоў! Гэта жах! Гэты чалавек кіруе краінай», — адзначыла Zosia Fedchuk.

«Ой, па галоўцы пагладзіў, грошыкаў даў, а чаго яшчэ прымітыўнаму піяністу з «Квартала» трэба...» — падсумавалі чытачы.

Раней кіраўнік Белага дома заявіў, што спадзяецца адночы зноў наведаць Украіну, куды прыязджаў у 2017 годзе. У краіне ён апошні раз быў у якасці віцэ-прэзідэнта перад сыходам з пасады Барака Абамы.

## Пенсіянерка раздала ўсе грошы, якія выйграла ў латарэю

**72-гадовая пенсіянерка з Дэрбішыра (Англія) Кэт Скот выйграла 140,9 тысячы фунтаў стэрлінгаў (больш як 150 тысяч долараў) у паштовай латарэі і раздала ўсе грошы праз некалькі гадзін, паведамляе Daily Mirror.**

Падчас пандэміі Скот дапамагала мясцовым урачам: яна пашыла сотні медыцынскіх халатаў для работнікаў бальніц і дамоў састарэлых. «Гэта была цяжкая праца, але гэта не мела значэння: я ведала, што ўсе мае намаганні пойдуць на добрую справу», — расказала брытанка.

Частку выйграных у латарэю грошай Скот патраціла на пакупку і ўстаноўку дэфібрылятара ў мясцовае аддзяленне пошты. Яна таксама вырашыла падзяліцца выйгрышам з унукамі. Муж брытанкі Алан пакутуе на хваробу Паркінсана, таму яны не змогуць адправіцца ў падарожжа і вырашылі патраціць грошы на дапамогу іншым.

Раней паведамлялася, што жыхар амерыканскага штата Паўднёвая Караліна за два тыдні двойчы перамог у латарэі — з розніцай у адзінаццаць дзён.